
Фота Юрыя ІВАНОВА

# "Народны універсітэт працуе для народа"

***Увайшла ў вестыбюль Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў і нечакана трапіла на выступленне студэнцкага гурта. Яго артысты, апранутыя ў аўтэнтычныя строі, прыгожа спявалі старажытныя беларускія песні, выводзілі нетаропка, з годнасцю, як гэта калісьці рабілі продкі, карункі старых танцаў. З захапленнем назіралі за маляўнічай дзеяй будучыя культуролагі, бібліятэкары, беларускія зоркі эстрады. У паветры лунаў малады дух творчасці. Пасля невялікага канцэрта юнакі і дзяўчаты хутка разбегліся па аўдыторыях. А мне ўсё не верылася, што Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў нядаўна разменяў чацвёрты дзесятак.***
***Яго рэктар Ядвіга ГРЫГАРОВІЧ удакладніла, што дзверы ВНУ ўпершыню адчыніліся для студэнтаў 1 кастрычніка 1975 года.***

**— Ці сапраўды універсітэт культуры быў створаны па ініцыятыве Пятра Машэрава?**

— Так, па асабістым рашэнні Машэрава, якое, я лічу, было вельмі своечасовым. Тады многія разумелі, што Беларусі патрэбны ўласны навуковы, творчы цэнтр, які пачне абагульняць усю культурна-асветную і ідэалагічную работу, што вядзецца ў дзяржаве. У нас не было тады ніводнага дыпламаванага спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па дадзеных спецыяльнасцях. Запрасілі навукоўцаў (кандыдатаў і дактароў навук) з Ленінграда, Масквы, Украіны, якія пачалі выкладаць у Мінскім інстытуце культуры. Менавіта яны на працягу дваццаці гадоў трымалі высокі ўзровень нашай вышэйшай навучальнай установы. За гэты час, на жаль, не былі падрыхтаваны беларускія навуковыя кадры, бо не існавала аспірантуры. Толькі ў бібліятэчнай справе назіраліся нейкія зрухі, хаця зацвярджэнне спецыялістаў суправаджалася немалымі цяжкасцямі. Бо ў розных краінах дадзеная навука адносіцца да розных галін: у Еўропе да філасофіі, а ў краінах СНД — да педагогікі, часткова — да гісторыі. І такая нявызначанасць ускладняла шлях абароны навуковых ступеняў...

У 1993 годзе, калі інстытут культуры стаў універсітэтам, было ўведзена 10 спецыяльнасцей і 17 спецыялізацый. З таго часу універсітэт паступова і, я б сказала, рашуча пачаў пашыраць колькасць спецыялізацый, удасканальваць планы і навучальны працэс, забяспечваць падрыхтоўку кадраў для ўсёй галіны культуры.

Ужо праз тры гады, з 1996-га, пачалася падрыхтоўка аспірантаў па спецыяльнасцях "бібліятэказнаўства і бібліяграфія", "тэорыя і методыка сацыякультурнай дзейнасці". Пасля далучылася аспірантура па тэорыі і гісторыі мастацтваў. Крыху пазней распачалася абарона дысертацый па культуралогіі і па музеязнаўстве.

Сёння універсітэт рыхтуе спецыялістаў ад сярэдняга да вышэйшага спецыяльнага звяна. У структуры ВНУ — каледжы, гімназіі, навучэнцы якіх — патэнцыяльныя студэнты універсітэта. Таксама ёсць падрыхтоўчае аддзяленне. Гэта першы этап. Другі — пяцігадовае навучанне ва універсітэце. На трэцім этапе студэнты, схільныя да навуковай, выкладчыцкай дзейнасці, могуць паступіць у гадавую магістратуру. Пасля ідзе чацвёрты этап, калі найбольш таленавітыя і падрыхтаваныя паступаюць у аспірантуру і абараняюць дысертацыю. На пятым этапе самыя здольныя кандыдаты навук вучацца ў дактарантуры і абараняюць доктарскія дысертацыі. Універсітэт таксама мае факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Наш выпускнік мае магчымасць за 8—9 месяцаў атрымаць і другую спецыяльнасць.

Такім чынам, за трыццаць гадоў склалася дакладная сістэма падрыхтоўкі кадраў. 16 спецыяльнасцей і 47 спецыялізацый забяспечваюць практычна ўсе кадравыя патрэбы галіны культуры. Але працы яшчэ больш чым дастаткова. Паводле статыстыкі, толькі 32 працэнты работнікаў культуры маюць вышэйшую адукацыю.

Лічу, што наша галоўнае дасягненне ў тым, што універсітэт знайшоў сваё месца ў структуры вышэйшых навучальных устаноў. У нас навучаецца каля пяці тысяч студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў. Нашы выпускнікі запатрабаваныя ў дзяржаўных, камерцыйных і прыватных структурах.

**— У чым вы бачыце прыярытэт універсітэта?**

— Універсітэт — гэта не толькі навучальная ўстанова, але і шматгаліновы, профільны цэнтр адукацыі, навукі, творчасці і грамадскай дзейнасці краіны. Толькі за апошнія тры гады ва універсітэце апублікавана 530 падручнікаў, дапаможнікаў, манаграфій і буйных навуковых прац. Пагадзіцеся, гэта ўражвае. У нашых сценах працуюць навуковыя лабараторыі народных рамёстваў, народных духавых інструментаў, харэаграфіі, народнага касцюма. Прыярытэт нашай ВНУ — традыцыйная беларуская культура. Яна вывучаецца, даследуецца ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай культур. Навукоўцы вывучаюць нашы традыцыі, звычаі, абрады, мастацкую культуру, мову. Вынікі нашай творчай працы відавочныя. Напэўна, ніводнае сур'ёзнае культурна-мастацкае мерапрыемства не праходзіць без удзелу нашых студэнцкіх мастацкіх калектываў, якіх у нас больш за 50. Многія — пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў: "Валачобнікі", "Талака", "Светач", "Туцці", "Гуды", "Кардуус", "Грамніцы", "Мара", "Дабравест", вядомы далёка за межамі нашай краіны.

Выкладчыкі і студэнты універсітэта аказваюць дапамогу ўстановам культуры і адукацыі ў плане рэжысуры, арганізацыі, напісання сцэнарыяў самых розных мерапрыемстваў. Я не магу сказаць, што ў нас спрэс элітарныя калектывы, якія працуюць толькі на інтэлектуальную эліту. Гэта не так. Яны выступаюць па ўсёй Беларусі, у малых і вялікіх гарадах, на вуліцах, плошчах, на розных святах, водзяць карагоды, ладзяць гульні, спяваюць народныя песні, танчаць народныя танцы. Універсітэт культуры я сама сабе называю народным, бо ён і яго выпускнікі працуюць для народа. З 25 тысяч нашых выхаванцаў практычна ўсе ўладкаваныя па спецыяльнасці.

**— А колькі навукоўцаў падрыхтаваў універсітэт?**

— Кандыдатаў і дактароў навук, як ужо казалася, мы рыхтуем мэтанакіравана. Як правіла, многія з іх застаюцца працаваць у нас ці ў Нацыянальнай бібліятэцы. Сёння ва універсітэце выкладаюць аж 23 дактары навук. Старэйшае пакаленне — у асноўным выпускнікі аспірантур і інстытутаў Акадэміі навук, БДУ і Педуніверсітэта, якія абараняліся там па блізкіх нам спецыяльнасцях. Але ўсе маладыя дактары, — да шасцідзесяці, бо доктарам у трыццаць, зразумела, не становяцца, — нашы выпускнікі. Я магу з гонарам сказаць, што дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі — былы наш студэнт, аспірант, выкладчык, дэкан факультэта, які абараніў у нашым Савеце доктарскую дысертацыю. Сёння ў нас працуе 114 кандыдатаў навук, палова іх узрошчана ў нашым універсітэце . Штогод мы выпускаем 10—20 спецыялістаў, якія закончылі аспірантуру. Калі па Беларусі абараняемасць навуковай ступені складае 7 працэнтаў, дык у нас дасягае 40 працэнтаў. Канешне, не ўсе яны застаюцца ў alma-mater, раз'язджаюцца ў абласныя цэнтры, ідуць працаваць у іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы.

**— А ці шмат праблем сустракаецца на шляху тых, хто хоча прысвяціць сябе навуцы?**

— Праблемы ёсць. Зарплата выпускніка аспірантуры настолькі малая, што існаваць на яе цяжка. Зараз праблема адбору кадраў для аспірантуры вельмі вострая, бо жадаючых вучыцца няшмат. Канешне, спецыяліст са стажам, які мае рэгаліі, атрымлівае дастаткова высокую зарплату. Напрыклад, загадчыку кафедры, дэкану налічваецца да дзевяцісот тысяч рублёў, дацэнту каля 600—700 тысяч, а малодшаму выкладчыку — 200—300 тысяч рублёў. Мы імкнёмся падтрымліваць моладзь. Выкладчыкі да 30 гадоў атрымліваюць стабільную надбаўку да зарплаты — 25 працэнтаў, прэміі — ад 40 працэнтаў, акрамя таго ім зніжаецца вучэбная нагрузка на 10 працэнтаў, аплачваецца пазапланавыя віды работ.

**— Вы зазначылі, што прыярытэт для універсітэта культуры — захаванне народнай культуры, традыцый, беларускай мовы. Практыка паказвае, што не ўсе выпускнікі сярэдніх школ, вышэйшых навучальных устаноў, нават гуманітарных, валодаюць мовай тытульнай нацыі. А вашы студэнты вызначаюцца ў гэтым неблагой падрыхтаванасцю, а таксама цудоўна ведаюць нацыянальную і сусветную гісторыю, культуру, мастацтва...**

— Мы гэтаму надаём вялікую ўвагу. Як можа несці высокую культуру спецыяліст, які кепска ведае мову свайго народа? Яго нельга лічыць адукаваным, нават калі добра валодае рускай ці замежнымі мовамі. Мова — не проста сродак выказвання думак, гэта кодавая сістэма генетычных нацыянальных асаблівасцей чалавека: яго ўспрымання свету, мыслення, фізіялагічных асаблівасцей (артыкуляцыі, працы нёба, звязак, мышцаў твару і г.д.). Мова — той код, тыя знакі, якімі перадаецца наша ментальнасць, нашы рэакцыі на акаляючы свет, гэта аснова для разумовай дзейнасці чалавека. Калі глядзіш інтэрв'ю па тэлебачанні ўкраінскіх, расійскіх дзеячаў, дык адзначаеш, што яны выкладаюць, думку, кожны на сваёй мове, дакладна, ясна, не задумваючыся. У нас нават вельмі адукаваныя людзі, гаворачы па-руску, часам з цяжкасцю фармулююць думку, робяць паўзы паміж словамі, у іх назіраецца пэўная коснамоўнасць, скажэнне рускага вымаўлення. Здаецца, апроч псіхалогаў, мала хто разумее, што мозг чалавека, тысячагоддзямі выпрацоўваючы спосаб перадачы думкі, прыстасаваў апараты яе трансляцыі ў нашым выпадку да беларускай мовы, і размаўляючы на іншай мове, мы задаём яму двайную работу. Узяць хаця б пытанне аб беларускасці нашай эстрады. Адкажу, што зрухі ёсць, але назіраецца развіццё не беларускай, а поп-культуры, не маючай нацыянальных прыкмет. Каб у мяне, скажам, запыталіся: назавіце беларускую эстрадную зорку, я б адказала — Ірына Дарафеева, разумніца, выдатніца, атрымала чырвоны дыплом нашага універсітэта, працуе заўзята і таленавіта. Яе стыль выканання, яе эстрадная манера, часам і рэпертуар — пацвярджэнне таго . Таксама назвала б і Паліну Смолаву, якая скончыла наш універсітэт па спецыяльнасці "народныя спевы" і таксама з чырвоным дыпломам. Яе голас гармонічна і натуральна кладзецца на мову, калі яна спявае па-беларуску. Памятаеце, пасля выступленняў на "Славянскім базары" ў яе запыталіся карэспандэнты: ці хваляваліся вы? І пачулі ў адказ: не, не хвалявалася, я не паспела спалохацца; я проста выйшла на сцэну і зрабіла ўсё, што магла. Чаму яна зрабіла ўсё, што магла? Проста яна спявала сваю беларускую песню, на сваёй, беларускай мове, якую глыбока адчувала. Я спачуваю людзям, якія, займаючыся ў Беларусі прафесійнай дзейнасцю ў сферы культуры ці адукацыі, так пакутуюць, размаўляючы па-руску, і не разумеюць, адкуль іх пакуты. Я ўжо не ўзгадваю пра адказнасць кожнага з іх перад Гісторыяй і Культурай. Трэба спрычыніцца да літаратуры, псіхалогіі, культуралогіі, лінгвістыкі. Трэба імкнуцца зразумець сябе, вывучыць свой унутраны свет. І тады будзе зразумела, што беларуская, родная мова — гэта яшчэ і камфортнасць існавання. Што тычыцца студэнтаў і выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, дык па-беларуску яны размаўляюць свабодна. Уся работа кіраўніцтва універсітэта культуры, вядзенне дакументацыі, творчых і афіцыйных мерапрыемстваў вядзецца на мове тытульнай нацыі Рэспублікі Беларусь.

**— Сістэма адукацыі нашай краіны, як гэта адзначаецца многімі, знаходзіцца на высокім узроўні. А ці прызнаюцца дыпломы беларускага універсітэта культуры ў іншых краінах свету?**

— Зрэшты, дыпломы ўсіх ВНУ нашай краіны будуць прызнавацца на еўрапейскім кантыненце, калі мы далучымся да Балонскага працэсу. У Беларусі робяцца крокі ў гэтым накірунку. Укараняецца паступова двухузроўневая сістэма адукацыі, ствараецца новая тэхналогія навучання студэнтаў, калі самастойная праца робіцца асноўнай, а выкладчык толькі дапамагае і кансультуе, уводзяцца рэйтынгавая, крэдытная, модульная сістэмы. Летась у Варшаве адбылася сустрэча рэктараў ВНУ славянскіх дзяржаў, дзе ішла размова пра стварэнне ўсходняй сеткі — ISTNET, куды ўваходзяць вядучыя 40 універсітэтаў краін Усходняй Еўропы.

Што датычыць дыпломаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, — на сённяшні дзень яны прызнаны ў Даніі, Германіі, Польшчы, Балгарыі і інш.

**— А ці займаецеся вы выкладчыцкай дзейнасцю?**

— Выкладаю на працягу многіх гадоў адзін прадмет — агульную педагогіку. Нядаўна падлічыла, колькі гадоў я выкладаю, — і мне стала трошачкі страшнавата. Атрымліваецца — 37 гадоў! Стараюся пастаянна вучыцца. На стале ў мяне, як бачыце, ляжаць новыя падручнікі па педагогіцы, іншая спецыяльная літаратура. Можна быць рэктарам, загадчыкам кафедры, але як толькі ты заканчваеш выкладчыцкую працу — перастаеш быць выкладчыкам. І таму я працавала і, спадзяюся, колькі мне Бог дасць здароўя, столькі буду выкладаць сваю любімую педагогіку, бо лічу яе навукай, якая дапамагае чалавеку жыць у грамадстве, разумець іншых.

**Гутарыла**
**Наталля КІРПІЧЭНКАВА**